**М.Л.Кузьмініч**, *дацэнт*

# АРГАНІЗАЦЫЯ КАНТРОЛЮ ЗА ВЫКАНАННЕМ ПАТРАБАВАННЯЎ АДУКАЦЫЙНЫХ СТАНДАРТАЎ ПА СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫІ

Працэс абнаўлення зместу навучання ў вышэйшых навучальных установах, які распачаўся ў канцы 1980-х гадоў і набыў перманентны характар, разам са станоўчымі вынікамі мае некаторыя адмоўныя.

З аднаго боку, пачаўся пераход на новыя прынцыпы арганізацыі кіравання адукацыяй, калі вышэйшыя навучальныя ўстановы атрымалі больш свабоды ў вызначэнні накірункаў падрыхтоўкі спецыялістаў, удакладненні зместу навучальнага працэсу, распрацоўцы адукацыйных тэхналогій. На змену дэталёвай рэгламентацыі працы выкладчыка, студэнта, навучальнай установы прыйшло разуменне неабходнасці лібералізацыі дзейнасці педагагічнага калектыву пры ўмове яе адпаведнасці крытэрыям, з дапамогай якіх можна забяспечыць дзяржаўны кантроль за эфектыўнасцю функцыянавання педагагічнай сістэмы, яе структурных элементаў, работы канкрэтнага калектыву выкладчыкаў.

З другога боку, большая дыферэнцыяцыя навучання на асобных спецыялізацыях суправаджалася перанасычэннем вучэбнага плана, перагрузкай студэнтаў і інш. Таму ўзнікла неабходнасць ва ўдакладненні абавязковага для ўсіх адукацыйна-прафесійнага мінімуму, у выпрацоўцы стандартаў педагагічнага працэсу на аснове дзяржаўных нарматываў.

Адукацыйны стандарт — дзяржаўная норма адукаванасці, якая ўдакладняе змест і структуру адукацыі, узровень засваення яе зместу, а таксама формы і метады вымярэння, ацэнкі вынікаў навучальнай дзейнасці. Гэта дзяржаўныя патрабаванні да ўзроўню падрыхтоўкі выпускнікоў.

Асноўнымі аб'ектамі стандартызацыі з'яўляюцца сістэма адукацыі (яе ступені, пералік спецыяльнасцей, дзяржаўныя патрабаванні да абітурыентаў і выпускнікоў, крытэрыі ацэнкі ўзроўню адукацыі, кваліфікацыі), змест адукацыі (вучэбныя планы, вучэбныя дысцыпліны, курсы, праграмы), кіраванне адукацыяй (планаванне, арганізацыя, кантроль, ацэнка вынікаў, каардынацыя) і працэс навучання (сродкі, арганізацыйныя формы, тэхналогіі).

Стандарт спецыяльнасці, спецыялізацыі вызначае мэты навучання, кампанентны склад (пералік дысцыплін) агульнай і спецыяльнай падрыхтоўкі спецыяліста.

Стандарт асобнай дысцыпліны ўключае мэты навучання, кампанентны склад курса (раздзелы, тэмы, вучэбныя элементы), асноўныя заканамернасці, паняцці, узроўні іх увядзення, плануемы ўзровень валодання імі (пералік ведаў студэнта, уменняў, навыкаў і асобасных якасцей будучых спецыялістаў).

Ён павінен адпавядаць наступнаму патрабаванню: яго змест можна колькасна вымерыць і даць яму якасную ацэнку. Для гэтага мусіць здзяйсняцца бягучы і тэматычны кантроль за вучэбнай дзейнасцю студэнтаў, што заканчваецца рубежнымі (у адпаведнасці з узроўнямі адукацыі) і выніковымі праверкамі выканання патрабаванняў дзяржаўнага адукацыйнага стандарта.

Існуе шэраг формаў дзяржаўнага кантролю за стандартамі адукацыі: атэстацыя і акрэдытацыя ВНУ асобных спецыяльнасцей і спецыялізацый, кантроль за выкананнем стандартаў у працэсе навучання, атэстацыя студэнтаў розных курсаў на кваліфікацыйных дзяржаўных іспытах, выкананне кантрольных тэставых заданняў, якія ахопліваюць асноўныя віды прафесійнай дзейнасці спецыяліста, веданне тэорыі, заканамернасцей і паняццяў, засваенне агульнавучэбных ведаў і ўменняў, методыкі самастойнай работы, навыкі самаадукацыі і інш.

Атэстацыя студэнтаў па выніках праходжання навучання на розных узроўнях падрыхтоўкі можа

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праводзіцца універсітэтам. Так забяспечваецца самакантроль выканання дзяржаўных адукацыйных стандартаў.

Кантроль за якасцю падрыхтоўкі спецыялістаў патрабуе распрацоўкі сістэмы прафесійна арыентаваных крытэрыяў, адпаведных механізму дыягностыкі. Яны павінны адпавядаць абагульненай мадэлі спецыяліста дадзенага профілю з улікам вызначаных па кожнай дысцыпліне, тэме, уроку мэт. Мадэліраванне профіляў спецыяліста ажыццяўляецца ў выглядзе навукова абгрунтаванай сістэмы відаў тэарэтычнай, прафесійна-практычнай, грамадскай дзейнасці, якія той будзе выконваць.

Віды дзейнасці спецыяліста і крытэрыі якасці яго падрыхтоўкі павінны адпавядаць зместу навучання, выкарыстоўваемым у навучальным працэсе формам, сродкам і метадам. Так забяспечваецца ўзаемасувязь кампанентаў тэхналагічнай падсістэмы навучальнага працэсу з прафесійнай дзейнасцю будучага спецыяліста, інструментарыем (крытэрыямі, працэдурай правядзення) дыягностыкі якасці яго падрыхтоўкі.

Асновай распрацоўкі комплексу тэставых (кантрольных) заданняў для выпускнікоў спецыялізацыі можа стаць пералік дысцыплін прафесійнага блока. Іх выкарыстанне дазволіла б вызначыць узровень адпаведнасці прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў да рашэння пытанняў мастацтва і культуры, ступень дасягнення вучэбных мэт, адпаведнасць атрыманых вынікаў пастаўленым задачам. Інакш кажучы, размова ідзе аб вызначэнні мэт спецыяльнай падрыхтоўкі студэнтаў.

У кваліфікацыйных характарыстыках спецыялістаў для апісання канчатковых мэт падрыхтоўкі прапануецца выкарыстоўваць мову абагульненых прафесійных задач, а таксама абагульненых структур дзейнасці, звязаных з іх вырашэннем. Гэта дазваляе, на наш погляд, праектаваць гэтую дзейнасць на вучэбную, арганізоўваць фарміраванне адэкватных прафесійным задачам рацыянальных прыёмаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

практычнай і разумовай дзейнасці студэнтаў. Так адбываецца пераход ад прадметнай арыентацыі ў навучанні да разумнага спалучэння прадметнай і метадалагічнай падрыхтоўкі, што забяспечвае прафесійную мабільнасць выпускніка.

Кожны тып прафесійных задач павінен быць шматварыянтным, улічваць межы, умовы дзейнасці, паказчыкі паспяховасці вырашэння задач і інш. Прафесійныя задачы ўяўляюцца як набор кваліфікацыйных заданняў, якія могуць выкарыстоўвацца для атэстацыі выпускніка.

На сённяшні дзень дыягностыцы, як правіла, падлягае ступень сфарміраванасці ў будучага спецыяліста ведаў, уменняў, навыкаў, якасцей па асобнай вучэбнай дысцыпліне ці ўзровень сфарміраванасці асобы спецыяліста ўвогуле (што, дарэчы, даволі праблематычна ў сувязі з недастатковай распрацаванасцю ў педагогіцы і псіхалогіі агульных праблем фарміравання асобы).

Такім чынам, прадметны падыход да пабудовы цэласнай прафесійнай дзейнасці будучага спецыяліста пераносіцца на змест высвятлення ўзроўню падрыхтоўкі студэнта. Але практыка сведчыць, што не заўсёды адзнакі па асобных дысцыплінах адпавядаюць узроўню падрыхтоўкі да вырашэння прафесійных праблем. Таму ў якасці інструмента, што дазваляе выявіць наяўнасць апісанай у спецыяліста ўласцівасці ці прыметы, лепш выкарыстоўваць не пытанні па асобных прадметах, а спецыяльныя кантрольныя заданні-тэсты, выкананне якіх сведчыла б аб наяўнасці ў выпрабоўваемага прыметы ці ўласцівасці, а таксама дазваляла вымерыць ступень выяўлення прыметы. Па змесце кантрольныя заданні падзяляюцца на тэсты агульнага развіцця, паспяховасці, інтарэсаў, здольнасцей і інш. Для вызначэння ўзроўню ведаў, уменняў і навыкаў навучэнцаў па вучэбнай дысцыпліне выкарыстоўваюцца тэсты паспяховасці.

У ходзе ўдасканалення навучальнага працэсу ў ВНУ культуры і мастацтва прадпрымаліся спробы распрацоўкі тэставых заданняў для выпускнікоў мастацкіх



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спецыялізацый. Гэта было выклікана перш за ўсё імкненнем атрымаць інструмент, з дапамогай якога можна было б вызначаць узровень падрыхтаванасці выпускнікоў да прафесійнай дзейнасці. Натуральна, якасць падрыхтоўкі спецыялістаў у сваю чаргу сведчыць аб узроўні арганізацыі навучальнага працэсу, эфектыўнасці педагагічнай дзейнасці, а значыць, выкананні патрабаванняў адукацыйных стандартаў.

У працэсе ўкаранення адукацыйных стандартаў у вышэйшых навучальных установах актуалізуецца праблема распрацоўкі тэставых заданняў як дзейснага сродку дыягностыкі эфектыўнасці функцыянавання навучальнай установы.

У навучальным працэсе фарміруюцца пэўныя рысы асобы студэнта, асоба ўвогуле. Таму распрацоўцы кантрольных заданняў папярэднічала апісанне якасцей асобы, наяўнасць якіх трэба было вызначыць і па магчымасці вымерыць сілу іх выяўлення. Сучасны ўзровень развіцця псіхолага-педагагічнай навукі з найбольшай упэўненасцю дазваляе весці гаворку аб вымярэнні паспяховасці засваення студэнтамі вучэбных прадметаў. Складанасці выклікае тое, што цэласная прафесійная дзейнасць фарміруецца ў працэсе вывучэння шэрага прадметаў і ўзровень паспяховасці засваення кожнага з іх далёка не заўсёды сведчыць аб паспяховасці засваення прафесіі спецыяліста. Таму сукупнасць кантрольных заданняў павінна мадэліраваць цэласную карціну прафесійнай дзейнасці. Выконваючы іх, студэнт павінен выкарыстоўваць веды, якія атрымаў пры вывучэнні ўсіх прадметаў. Кантрольныя заданні мадэліруюць перш за ўсё канкрэтныя ўменні, неабходныя спецыялісту ў вытворчай дзейнасці.

Распрацоўцы кантрольных заданняў павінна папярэднічаць глыбокае даследаванне тэхналогіі прафесійнай дзейнасці спецыяліста, яго функцыянальных абавязкаў, вырашаемых праблем, відаў прафесійнай дзейнасці і інш. Што датычыць дзейнасці спецыялістаў пэўнага профілю ў галіне культуры і мастацтва, то навукова



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абгрунтаваная карціна іх прафесійнай дзейнасці пакуль не распрацавана, хаця ёсць дысертацыі, вынікі сацыялагічных даследаванняў і інш.

Зрухі ў грамадстве ўнеслі карэктывы ў дзейнасць культурна-асветных устаноў, што ў сваю чаргу патрабавала ўнесці адпаведныя змены ў змест падрыхтоўкі спецыялістаў. Адпаведна кантрольныя заданні павінны правяраць падрыхтаванасць выпускніка да работы ў новых умовах па асноўных накірунках прафесійнай дзейнасці: мастацка-асветніцкая дзейнасць, выхаваўчая, педагагічная, метадычная, арганізатарская, даследчыцкая, сацыяльна-прафесійная, кіраванне творчымі калектывамі, установамі культуры.

Пры распрацоўцы кантрольных заданняў пэўныя цяжкасці выклікаюць адказы на пытанні аб тым, што падлягае праверцы — тэарэтычныя веды ці практычныя ўменні, а калі тое і другое, то ў якіх суадносінах? Наступнае пытанне: па якіх параметрах трэба выяўляць якасць засваення прафесійнай дзейнасці, як вымяраць яе па кожным параметры? Складана распрацаваць і ўзоры выканання кантрольных заданняў.

Улічваючы тое, што яны павінны мадэліраваць змест і тэхналогію дзейнасці арганізатара мастацкай творчасці, неабходна даць характарыстыку прафесійнай дзейнасці спецыяліста, вылучаючы пры гэтым яе віды, функцыі, прафесійныя праблемы, шляхі іх вырашэння, або пабудаваць мадэль прафесійнай дзейнасці спецыяліста. Потым трэба згрупаваць вылучаныя прафесійныя праблемы ў адпаведнасці з відамі дзейнасці, зыходзячы з таго, што патрабуецца ад выпускніка: узнаўленне 1) тэарэтычных ведаў і алгарытму дзейнасці ў тыповай сітуацыі (рэпрадуктыўны ўзровень), 2) алгарытму дзейнасці ў нетыповай сітуацыі (эўрыстычны ўзровень), 3) дзеянняў у праблемнай сітуацыі (узровень творчасці). Пасля фармулююцца праблемы ў выглядзе кантрольных заданняў, якія патрабуюць адзначанага рашэння, і эталонныя варыянты рашэння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аднак наяўнасць тэстаў і эталонных адказаў на іх не дазваляе вымерыць ступені выяўлення якасцей спецыяліста. Для гэтага патрэбны такія параметры: аб'ём засвоенага вучэбнага матэрыялу — колькасць выкананых тэставых заданняў; ступень аўтаматызацыі засваення — хуткасць выканання тэставых заданняў; ступень асэнсаванасці засваення —уменне абгрунтаваць выбар дадзенага шляху рашэння; узровень засваення (майстэрства) — рэпрадуктыўная, эўрыстычная, творчая дзейнасць.

Аналіз вынікаў выканання кантрольных заданняў дапаможа выкладчыку знайсці рэзервы павышэння педагагічнага майстэрства, унесці карэктывы ў навучальны працэс, удасканаліць змест чытаемага курса і кантрольныя заданні. Знаёмства студэнтаў з вынікамі тэсціравання таксама ўяўляецца карысным, бо яно ўказвае на недахоп ведаў і ўменняў, паказвае напрамкі самаадукацыі, самаразвіцця.

Укараненне адукацыйных стандартаў не пазбаўляе выкладчыка магчымасці рэалізоўваць творчыя педагагічныя здольнасці ў межах, вызначаных нарматывамі. Спецыфіка дзейнасці педагога заключаецца ў тым, што яе поўная алгарытмізацыя немагчымая, бо існуючыя педагагічныя прыёмы, навыкі ўвесь час выкарыстоўваюцца ў нестандартных сітуацыях, што патрабуе карэкцыі. Педагог выкарыстоўвае метадычныя распрацоўкі, рэкамендацыі, акумулюе вопыт калег, прапускае яго праз сябе. Ён абапіраецца на заканамернасці педагагічнага працэсу, але рэалізуе іх як непаўторная індывідуальнасць.

Такім чынам, адукацыйны стандарт не супрацьпастаўляецца педагагічнай творчасці выкладчыка, а надае ёй накірунак, дае магчымасць змерыць эфектыўнасць працы педагога і навучальнай установы. Адным са сродкаў выяўлення эфектыўнасці педагагічнай дзейнасці могуць стаць вынікі атэстацыі студэнтаў з выкарыстаннем тэставых кантрольных заданняў. Апошнія дазволяць праверыць адпаведнасць падрыхтоўкі студэнтаў патрабаванням практыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ